# «МУЗЫКА-ХВАТ СХІЛІЎСЯ ВУХАМ»



**Па гарызанталі: 3.** «Музыка-хват схіліўся вухам, // Як быццам ён ... слухаў». З рамана ў вершах П. Місько «Пакуль зямлю мілуе сонца» («Вяселле»). **9.** Партыя для аднаго голасу. **10.** Беларускі народны духавы інструмент. **11.** Дадатковае асвятленне. **12.** Дах на слупах. **15.** Кінамастацтва (перан.). **16.** «Пакуль што ... мой спявае — // Радзіма-матуля жывая». З верша С. Валодзькі «Спяваюць жанчыны». **18.** Шчыпковы музычны інструмент. **19.** Асобная сцэна або эпізод з кінафільма. **20.** Калі рак свісне і ... заспявае (прык.). **21.** Буйная жывёліна. **24.** Месца іншай афарбоўкі на якой-небудзь паверхні. **25.** Горад у Саудаўскай Аравіі, порт на Чырвоным моры. **28.** ...-матар. ВНУ, у якім вучыўся. **32.** «Сядзіць ... на калодзе, // На скрыпачцы іграець, // Дзіцяняты-медзвядзяты // Струны напраўляюць». Прыпеўка. **34.** «Нептун з прыгожанькай наядай // Пайшоў упрысядку «казака»; // Нябось і ў старога гада//... грае, як у дзецюка». З паэмы «Тарас на Парнасе». **35.** «А ў нашага свата // Вясёлая .... // Бычкі граюць у смычкі, // Падцёлкі — у свісцёлкі». Прыпеўка. **36.** «Пад цымбалы, пад цымбалы // Тут ... скакала! // А цяпер пад тыя гукі // Скачуць праўнукі і ўнукі». З верша А. Пісьмянкова «Без цымбалаў немагчыма».

**Па вертыкалі: 1.** Музычна-паэтычны твор для голасу з інструментальным суправаджэннем. **2.** «Бацька грае, ... басуе, // Дачка замуж галасуе. // Бацька жыта прадае, // Дачку замуж аддае». Прыпеўка. **3.** Атмасферныя ападкі. **4.** Пародзісты конь. **5.** Музычна-драматычны твор. **6.** Старажытнае высокакультурнае індзейскае племя, якое жыло ў Паўднёвай Амерыцы. **7.** «Аддай струны зорам, // ... — вербам, калінам, // А радасць — азёрам». З верша М. Танка «Лірнік». **8.** Загадка. **13.** «У культуры асновай служыць ...». Р. Ландау. **14.** Музычны штрых, які прадпісвае выконваць гукі адрывіста. **16.** Аздоба, якую прышпільваюць на жаночую прычоску. **17.** Танец — шчасце, песня — ... (балкарская прык.). **22.** Апора для спіны ў крэсле. **23.** «... — ілгун, але мастацтва — праўда». А. Маруа. **26.** Палка ў руках рэгулproўшчыка вулічнага руху. **27.** ... мілей свае, а жонкі — чужыя (прык.). **29.** Языком, як ... хвастом (прык.). **30.** Пра шкадлівага чалавека (перан., разм.). **31.** І ... песні пяе, калі добра жыве (прык.). **33.** Клавішы гармоніка, духавых інструментаў.

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,**
*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі: 3.** Гармонік. **9.** Арыя. **10.** Дуда. **11.** Падсветка. **12.** Навес. **15.** Экран. **16.** Народ. **18.** Арфа. **19.** Кадр. **20.** Рыба. **21.** Лось. **24.** Пляма. **25.** Джыда. **28.** Альма. **32.** Мядзведзь. **34.** Кроў. **35.** Хата. **36.** Лявоніха.

**Па вертыкалі: 1.** Раманс. **2.** Сын. **3.** Град. **4.** Рысак. **5.** Опера. **6.** Інкі. **7.** Сум. **8.** Шарада. **13.** Вяршыня. **14.** Стаката. **16.** Наколка. **17.** Радасць. **22.** Спінка. **23.** Мастак. **26.** Жазло. **27.** Дзеці. **29.** Цяля. **30.** Язва. **31.** Кот. **33.** Лад.

Сардэчна віншуем вядучага рэдактара **Марыю ЦЯРЭШКУ** — сапраўднага майстра на ўсе рукі на рабочым месцы і спагадлівага, светлага чалавека па жыцці — з цудоўнай, незабыўнай падзеяй — ВЯСЕЛЛЕМ!

Зычым, каб у твой дом прыйшло ШЧАСЦЕ! Каб быў ён поўнай чашай. І сонца заўсёды свяціла ўваконца!

Каб жылі са сваім суджаным душа ў душу. Няхай будзе шмат кветак і шмат дзетак!

*Звяздоўцы.*

## ФІЛЬМ ПРА ЛЕСАВОДАЎ

Міністэрства лясной гаспадаркі праводзіць конкурс па выбары выканаўцы для здымак фільма аб лясной галіне. Тэрмін падрыхтоўкі стужкі — да 20 жніўня. Да ўдзелу запрашаюцца арганізацыі і ІП, якія спецыялізуюцца на падрыхтоўцы іміджавых стужак. Галоўная мэта праекта — паказаць штодзённую працу лесаводаў і дзейнасць устаноў і прадпрыемстваў Міністэрства лясной гаспадаркі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## Даты Падзеі Людзі

### 14 ЧЭРВЕНЯ

**988** год — пачатак княжання ў Полацку Ізяслава Уладзіміравіча, сына Уладзіміра Святаславіча і Рагнеды Рагвалодаўны. Згодна з летапіснай легендай, за тое, што заступіўся за маці, малалетні Ізяслаў разам з ёй быў сасланы бацькам у полацкія землі ў пабудаваны для іх г. Ізяслаўль (цяпер — Заслаўе ў Мінскай вобл.) З яго імем звязана адраджэнне полацкай княжацкай дынастыі Рагвалодавічаў і палітычнай самастойнасці Полацкага княства. Даследчыкі лічаць, што пры ім адбылося прыняцце хрысціянства на Полаччыне, у Полацку створана адно з першых епіскапстваў, уведзена пісьменнасць. Памёр у 1001 годзе.

**1928** год — нарадзіўся Эрнеста Чэ Гевара, лацінаамерыканскі рэвалюцыянер. У доме бацькоў была вялікая бібліятэка, і Эрнеста рана прыахвоціўся да чытання. З вялікім захапленнем ён чытаў працы Маркса, Энгельса, Фрэйда, любіў паэзію. Пасля заканчэння ўніверсітэта ў 1953 годзе Гевара працаваў урачом, а потым накіраваўся ў падарожжа па краінах Лацінскай Амерыкі. Спачатку пабываў у Коста-Рыцы, дзе ад кубінскіх палітэмігрантаў упершыню пачуў пра Фідэля Кастра, а затым накіраваўся ў Гватэмалу, дзе ў 1954 годзе ЗША арганізавалі ваенную інтэрвенцыю. Менавіта тады Эрнеста зацвердзіўся ў думцы, што рэвалюцыю без крыві не робіць, і паспрабаваў арганізаваць супраціўленне. Але праамерыканскі ўрад паставіў маладога рэвалюцыянера па-за законам, і яму давялося хавацца. Гевара перабраўся ў Мехіка. Тут у 1955 годзе ён пазнаёміўся з братамі Кастра, якія распрацоўвалі план звяржэння дыктатуры Батысты на Кубе і планавалі ўзяць кіраванне краінай у свае рукі. Эрнеста захапіўся іх ідэямі і ўступіў у рэвалюцыйны атрад, у трэніровачным лагеры пад Мехіка вывучаў ваенную справу. Менавіта тады ад сваіх новых сяброў ён і атрымаў мянушку Чэ. 25 лістапада 1956 года на яхце «Гранма» рэвалюцыянеры адплылі на Кубу, дзе Гевара прымаў самы актыўны ўдзел у рэвалюцыйна-вызваленчай вайне. 9 кастрычніка 1967 года апошні рэвалюцыянер XX стагоддзя Эрнеста Чэ Гевара быў расстраляны амерыканскімі «рэйнджарамі» ў горадзе Ла-Ігера (Балівія).

**1985** год — пяццю краінамі ЕС (Францыяй, Бельгіяй, ФРГ, Люксембургам і Нідэрландамі) падпісана пагадненне аб адмене візавага кантролю на ўнутраных межах. Па месцы яго падпісання ў горадзе Шэнген (Люксембург) носіць назву Шэнгенскае пагадненне.

**1991** год – 25 гадоў таму выйшаў першы нумар газеты «Рэспубліка». Выданне Савета Міністраў Беларусі штодзень інфармуе пра падзеі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным, культурным жыцці. За час свайго існавання газета стала адным з самых папулярных друкаваных выданняў краіны, зарэкамендавала сябе як аўтарытэтная крыніца дакладнай і аб'ектыўнай інфармацыі. Сёння «Рэспубліка» ўваходзіць у склад медыяхолдынга «Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Віншуем калег!

РЭСПУБЛІКА ГАЗЕТА СОВЕТА МИНИСТРОВ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

### Было сказана

**Кузьма ЧОРНЫ, пісьменнік, публіцыст:**
*«Там, дзе пачынаецца абыякавасць, там недалёка і гібель».*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.43 | 17.06 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.41 | 17.23 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.33 | 17.06 |
| Гомель — | 4.33 | 21.20 | 16.47 |
| Гродна — | 4.54 | 21.56 | 17.02 |
| Брэст — | 5.04 | 21.48 | 16.44 |

## Месяц

*Перш. квадра 12.06 — 19.06. Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

**Пр.** *Веры, Валяр'яна, Дзяніса, Харытона, Усціна.* **К.** *Элізы, Эльвіры, Юстыны, Базыля, Валерыя, Міхала.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Такую страшную ляльку пасадзілі на гэтую вясельную машыну!**

**— Ды цішэй ты... Гэта нявеста ў люк высунулася.**

Дыялогі ў сеціве.

22:00 — Мілы, хто ў цябе на першым месцы — я ці футбол?

23:50 — Вядома ж, ты!

**У рэстаране на першым спатканні:**

**— Не налівайце мне больш — я ўжо такая, як вам трэба.**

Дзеці — кветкі жыцця :)

— Тата, а ты яшчэ вырасцеш?

— Не, сынок.

— А навошта ты тады ясі?..




Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2357.

Нумар падпісаны ў 19.30 13 чэрвеня 2016 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12